***Л. М. Гамеза,***
*доктар педагагічных навук*

# АСАБЛІВАСЦІ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ Ў ПРАЦЭСЕ ДЫСТАНЦЫЙНАГА НАВУЧАННЯ

З прыняццем Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі зроблены важны крок да ўдасканалення нацыянальнага заканадаўства па рэгуляванні грамадскіх адносін у сферы навучання і выхавання, перад якой стаіць задача інтэграцыі ў міравую адукацыйную прастору пры захаванні і развіцці традыцый сістэмы адукацыі. Да прыняцця Кодэкса аснову нарматыўнай базы сферы адукацыі складалі Закон «Аб адукацыі» і законы, якія рэгулявалі адносіны ў сферы прафесійна-тэхнічнай (2003 г.), спецыяльнай (2004 г.), агульнай сярэдняй (2006 г.) і вышэйшай адукацыі (2007 г.), а таксама Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2008 г. № 15 «Аб асобных пытаннях агульнай сярэдняй адукацыі». Ключавое месца ў дадзеным нацыянальным заканадаўстве займаў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб адукацыі», але ў ім многія важныя на сёння пытанні засталіся па-за сферай прававога рэгулявання. Кодэкс аб адукацыі стварае адзіны прававы механізм у галіне адукацыі. Адбылося скарачэнне колькасці нарматыўных прававых актаў, якія дзейнічалі ў гэтай сферы, ліквідуюцца супярэчнасці, дубліраванне ў прававым рэгуляванні.

Кодэкс вызначае адукацыю як навучанне і выхаванне ў інтарэсах асобы, грамадства і дзяржавы і замацоўвае патрабаванне падрыхтоўкі спецыялістаў не толькі якаснага ведавага, але і творчага ўзроўню. У гэтай сувязі патрабуе пільнай увагі дыстанцыйнае навучанне ў сферы беларускай адукацыйнай сістэмы, найперш пытанні яго арганізацыі, метадычнага забеспячэння, выкарыстання камунікатыўных і інфармацыйных тэхналогій, эфектыўнасці самастойнай работы і інш.

Прывядзём прыклад распрацоўкі электроннай лекцыі, у прыватнасці, па методыцы выкладання сінтаксісу ў сярэдніх агульнаадукацыйных установах.

Змест лекцыі ўключае наступныя пытанні:

1. Этапы вывучэння сінтаксісу ў сярэдніх агульнаадукацыйных установах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Задачы вывучэння сінтаксісу ў сярэдніх агульнаадукацыйных установах.

3. Вучэбна-моўныя ўменні, якія фарміруюцца на сінтаксічным узроўні.

4. Спецыфічныя прынцыпы вывучэння сінтаксісу.

5. Прыёмы размежавання даданых членаў сказа.

6. Тыпалогія практыкаванняў пры вывучэнні сінтаксісу ў сярэдніх агульнаадукацыйных установах.

У адносінах да курса роднай мовы ў агульнаадукацыйных установах сінтаксіс варта разглядаць як аснову, на базе якой асэнсоўваецца і засвойваецца камунікатыўны падыход у навучанні. Гэта аснова з'яўляецца перадумовай для інтэнсіўнага развіцця мыслення, вуснай і пісьмовай мовы вучняў, замацавання арфаграфічных навыкаў і пунктуацыйнай пісьменнасці на свядомай аснове (В. У. Протчанка). Фарміраванне сінтаксічных ведаў, уменняў і навыкаў адбываецца па наступных этапах:

1 этап – падрыхтоўчы, які падзяляецца на два падэтапы:

а) вывучэнне апераджальнага курса сінтаксісу і пунктуацыі ў 5 класе;

б) развіццё сінтаксічнага ладу мовы вучняў у працэсе выкладання фанетыкі, лексікі і фразеалогіі, словаўтварэння, марфалогіі ў 6–7 класах;

2 этап – асноўны, на якім выкладаецца сістэматычны курс сінтаксісу і пунктуацыі ў 8–9 класах;

3 этап – завяршальны, на якім паўтараецца і абагульняецца матэрыял па сінтаксісе пры напісанні сачыненняў, пераказаў, дыктантаў у 10–11 класах.

Навучанне сінтаксісу ў агульнаадукацыйных установах вырашае задачы:

– засваення ведаў аб мове на аснове свядомага авалодання сінтаксічнымі паняццямі;

– удасканалення маўленчай дзейнасці вучняў з пункту гледжання адпаведнасці сінтаксічнай норме;

– узбагачэння сінтаксічнага ладу мовы вучняў;

– стварэння грунту для асэнсаванага засваення вучнямі пунктуацыйных норм.

На сінтаксічным узроўні фарміруюцца пэўныя вучэбна-моўныя ўменні.

Па характары дзеянняў сінтаксічныя вучэбна-моўныя ўменні падзяляюцца на апазнавальныя; класіфікацыйныя; аналітыка-сін-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэтычныя. *Апазнавальныя* ўменні накіраваны на выяўленне вывучаемых сінтаксічных з'яў. *Класіфікацыйныя* неабходны для групоўкі сінтаксічных з'яў па пэўнай прымеце. *Аналітыка-сінтэтычныя* ўменні вызначаюць поўны разбор сінтаксічных адзінак, а таксама іх стварэнне.

Да спецыфічных прынцыпаў вывучэння сінтаксісу адносяцца:

– экстралінгвістычны – заключаецца ў супастаўленні сінтаксічных адзінак і рэалій, якія яны абазначаюць;

– функцыянальны – забяспечвае знаёмства з прызначэннем сінтаксічных адзінак (словазлучэння, сказа). Напрыклад:

а) словазлучэнне больш канкрэтнае, чым слова, выконвае намінатыўную функцыю;

б) сказ змяшчае паведамленні пра падзеі, факты, можа быць зарыентаваны на пошук інфармацыі, можа пабуджаць да дзеяння, змяшчаць просьбу, параду, загад, патрабаванне;

в) прызначэнне ўскладненых сказаў з адной прэдыкатыўнай асновай – перадаваць некалькі паведамленняў: адно асноўнае і адно або некалькі дадатковых;

г) функцыя складанага сказа – усебакова адлюстроўваць адносіны паміж падзеямі і фактамі;

– структурна-семантычны прынцып – увага надаецца будове сінтаксічнай адзінкі, яе семантыцы;

– прынцып міжузроўневых і ўнутрыўзроўневых сувязей – у поўнай меры праяўляюць сябе ўсе элементы моўнай сістэмы і сама сістэма ўвогуле;

– нарматыўна-стылістычны прынцып – адбор сінтаксічных канструкцый і іх лексічнага напаўнення з улікам сітуацыі маўлення. Напрыклад:

а) для гутарковага стылю характэрна ўжыванне няпоўных сказаў, эмацыянальна афарбаваных, з ярка выражанай устаноўкай уздзейнічаць на субяседніка;

б) навуковае маўленне вызначаецца складаным сінтаксісам, дзе ўсё падпарадкавана задачам паўнацэннага, лагічна несупярэчлівага апісання аб'екта з выяўленнем яго ўнутраных сувязей, а таксама ўмоў існавання.

Значных намаганняў патрабуе засваенне ведаў аб даданых членах сказа і іх размежаванні. Звернем увагу на выпрацоўку адпаведных прыёмаў:

1) пастаноўка марфалагічных і сінтаксічных пытанняў і іх супастаўленне:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– *займацца музыкай да работы* (да чаго?);
– *дзякуючы рабоце* (дзякуючы чаму?) *раскрыць свой патэнцыял;*
– *спадзявацца на работу* (на што?);
– *ганарыцца работай* (чым?);
– *затрымацца на рабоце* (на чым?).

Паставім да гэтых самых слоў сінтаксічныя пытанні: калі? чаму? на што? чым? дзе?

У ролі дапаўнення выступаюць словы, сінтаксічнае пытанне да якіх супадае з марфалагічным. Пры пастаноўцы да слова сінтаксічнага пытання, якое не супадае з марфалагічным, такое слова не можа быць кваліфікавана як дапаўненне. Калі яно пры дзеяслове – гэта акалічнасць, калі пры назоўніку – азначэнне;

2) замена члена сказа дададзенай часткай:

*Пры жаданні* (*Калі б было жаданне*) *ён змог бы мне дапамагчы* (акалічнасць умовы);

3) замена аднаго слова другім, блізкім па значэнні:

*Яго шчодрасцю я быў узрушаны да слёз* (*вельмі, незвычайна*) (акалічнасць меры і ступені);

4) замена недапасаванага азначэння дапасаваным:

*Дзверы адчыніліся, і ўвайшоў стары з сівой барадой (сівабароды).*

Але словаўтварэнне не бязмежнае: *Дзверы адчыніліся, і ўвайшоў стары з папругай;*

5) падстаноўка аднародных членаў сказа:

*Ехаў на калёсах* (*а потым вярхом*) (акалічнасць); *Самалёт ляціць над лесам* (*справа, злева*) (акалічнасць);

6) падстаноўка абагульняльнага слова да аднароднага рада слоў:

*Крыміналісту даводзілася выяўляць сапраўднасць* (*усіх*) *подпісаў і штампаў.*

У сучасных школьных падручніках па беларускай мове вылучаецца наступная тыпалогія практыкаванняў:

1. Практыкаванні аналітычнага тыпу, накіраваныя на развіццё ўмення выяўляць і характарызаваць сінтаксічныя канструкцыі:

а) выпісаць сінтаксічныя канструкцыі;

б) стварыць схемы сінтаксічных канструкцый;

в) выявіць адпаведнасць схем і сінтаксічных канструкцый;

г) згрупаваць сінтаксічныя канструкцыі па пэўнай прымеце;

д) прааналізаваць інфармацыю, адлюстраваную ў схемах сказаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

е) прааналізаваць схемы сказаў, выявіць агульнае і спецыфічнае;

ё) з прапанаваных выбраць канструкцыю, характэрную для пэўнага стылю;

ж) выявіць сінтаксічныя сродкі сувязі сказаў у тэксце.

2. Практыкаванні аналітыка-сінтэтычнага тыпу, накіраваныя на фарміраванне і ўдасканаленне сінтаксічнага ладу мовы вучняў:

а) скласці сказы па аналогіі з прапанаванымі;

б) трансфармаваць дадзеныя канструкцыі ва ўказаныя;

в) замяніць канструкцыі сінанімічнымі, вызначыць сферу іх ужывання ў маўленні;

г) ахарактарызаваць значэнне граматычнай асновы (асоба і яе дзеянне; асоба або прадмет і яго адметнасць, якасць; асоба і яе стан);

д) узнавіць прапанаваны тэкст з захаваннем яго сінтаксічных асаблівасцей.

3. Творчыя практыкаванні, накіраваныя на фарміраванне камунікатыўных уменняў:

а) стварыць сказы пэўнай структуры, мэтавай устаноўкі, рытмамеладычнага малюнка;

б) прапанаваныя значэнні і адносіны выразіць сінанімічнымі канструкцыямі, указаць сферу іх ужывання;

в) па схеме сказа скласці звязнае выказванне пэўнага тыпу маўлення;

г) па апорных словах скласці тэкст пэўнага тыпу і стылю;

д) адрэдагаваць тэкст, выправіць сінтаксічны манатон;

е) падрыхтаваць звязнае выказванне па пэўнай тэме, пэўнага тыпу і стылю маўлення, выкарыстоўваючы сінтаксічныя сродкі сувязі сказаў у тэксце (сінтаксічны паралелізм, парадак слоў у сказе, лагічны націск).

На сёння супрацоўніцтва педагога і навучэнца ў фармаце інфармацыйных тэхналогій – грунт, які дае магчымасць завочнай форме навучання, і асабліва дыстанцыйнай, развівацца і адпавядаць запатрабаванням на якасць адукацыйнай паслугі, якую чакае сучаснае грамадства.

---

1. *Мурина, Л. А.* Концепция обучения русскому языку в общеобразовательных учреждениях Республики Беларусь / Л. А. Мурина [и др.] // Русский язык и литература. – 2008. – № 1. – С. 3–10.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Гамеза, Л. М.* Комплексная метадычная сістэма ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў у працэсе навучання беларускай мове : дыс. … д-ра пед. навук / Л. М. Гамеза. – Мінск, 2009. – 264 л.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ